




# Днямі пачала працаваць выстаўка «Энцыклапедыя. Нацыянальны праект»

*24.12.2019 00:15* | Аўтар: **Вікторыя Целяшук** | **Культура**

**«Дзяржаўным народам прызнаецца той народ, які мае свае герб, гімн, сцяг, буквар і энцыклапедыю», — сцвярджаў некалі беларускі паэт Максім Танк. Словы класіка дарэчы і сёння, прынамсі на адкрыцці выстаўкі «Энцыклапедыя. Нацыянальны праект», якая пачала працаваць днямі ў музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі. Экспазіцыя прымеркавана да 50-годдзя стварэння першай беларускай універсальнай энцыклапеды.**



Выстаўка прадстаўляе гісторыю еўрапейскіх энцыклапедычных выданняў наогул — ад антычнасці да сучаснасці. Таму ў вітрынах знайшлося месца і «Натуральнай гісторыі» Плінія (у выданні XVI стагоддзя), і шэдэўру эпохі Асветніцтва, французскаму выданню «Энцыклапедыя, або Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў» Дэні Дзідро (1751—1780), і найбольш аўтарытэтнай з англамоўных энцыклапедый «Брытаніцы» (1875—1888), а таксама Энцыклапедыі Бракгаўза, якая датуецца 1882—1887 гадамі, і энцыклапедыям на нацыянальных мовах, якія ўбачылі свет у XIX—XX стагоддзях у Польшчы, Чэхіі, Расіі і Украіне.

Але галоўная ўвага, натуральна, аддадзена энцыклапедыі беларускай як аднаму з самых важных складнікаў працэсу самаідэнтыфікацыі і самасвядомасці народа. «Сапраўды, многія народы існавалі і існуюць у свеце, але не ўсе з іх дайшлі да нацыянальнай спеласці і фарміравання ўласнай ідэнтычнасці, свайго светабачання, якое ў сістэматызаваным выглядзе паўстае праз універсальную энцыклапедыю. Энцыклапедыя — гэта погляд народа на ўвесь свет навокал і сваё месца ў ім», — зазначае на гэты конт **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША.**

На выстаўцы шлях да нацыянальнага праекта адлюстраваны найбольш поўна. Тут сабраныя з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі і Нацыянальнага архіва, выдавецтва Беларуская «Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры архіўныя матэрыялы і выданні, якія паказваюць першыя спробы стварэння энцыклапедыі ў 20—30-х і 50-х гадах мінулага стагоддзя. Унікальныя дакументы, фотаздымкі і рабочыя матэрыялы дапамагаюць уявіць, як працаваў вялізны калектыў пад кіраўніцтвам галоўнага рэдактара, акадэміка і пісьменніка Петруся Броўкі. Асобна прадстаўлены вынік гэтай маштабнай навуковай і творчай работы — выданне-юбіляр, першая ў нашай краіне ўніверсальная «Беларуская савецкая энцыклапедыя» (яна ствараласа з 1969 да 1975 года і складалася з больш як 34 тысяч артыкулаў і 12 тысяч ілюстрацый, якія ўвайшлі ў 12 тамоў), а таксама нацыянальнае выданне ўжо суверэннай рэспублікі — «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 тамах (1996—2004). Убачыць усё гэта кніжнае багацце можа кожны карыстальнік бібліятэкі і наведвальнік сацыякультурнага цэнтра — выстаўка будзе працаваць да 17 лютага 2020 года.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

### Загаловак у газеце: Як пачыналася энцыклапедыя

### Чытайце таксама

- **Міншчына прэзентавала свой патэнцыял у Кітаі**
- **Як вясковая дзяўчына з Беларусі скарыла Парыж**
- **У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі ўпершыню прадстаўлены арыгінал Берасцейскай Бібліі**
- **У Мінску працуе выстаўка «Беларускі рубель. Гісторыя ў чвэрць стагоддзя»**
- **У Мінску стартавала спецыялізаваная выстаўка «Будпрагрэс-2019»**

Тэгі: выстаўка | энцыклапедыя | Музей кнігі

110 праглядаў Друкаваная версія

Падзяліцца:

Навіны | Папулярнае

11:04 У Мінску работнік выкраў у наймальніка грошы, якія той хаваў ад жонкі

10:32 Нацыянальны аэрапорт Мінск сустрэў 5-мільённага пасажыра

09:38 У Чэрвені 40-гадовы мужчына без прычыны пашкодзіў пяць аўтамабіляў

08:11 Прагноз надвор'я на 24 снежня

21:59 У Танзаніі матч перапыніўся з-за атакі пчол

УСЕ НАВІНЫ

Іншыя матэрыялы аўтара

- Гурт «Стары Ольса»: У Сургуце нас сустракалі каля трапа самалёта, як важных шышак!
- «Белкніга» адкрыла за два гады восем новых кнігарняў
- Георгій Калдун выйшаў у фінал украінскага вакальнага шоу X Factor
- Што такое «Юраўскі карагод», унесены ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА?
- Мурал з Мінска прызналі найлепшым у свеце

## Выбар рэдакцыі


Культура

Гурт «Стары Ольса»: У Сургуце нас сустракалі каля трапа самалёта, як важных шышак!

Калі музыку параўноўваць з вытанчанымі напоямі, то гурт «Стары Ольса», які першы адкрыў

0 254



Грамадства

Як выбраць ёлку

З 20 снежня ў Беларусі запрацавалі ёлачныя базары.

0 221


Грамадства

Якія адкрыцці зрабіў карэспандэнт «Звязды» на Іўеўшчыне

Разам з этнагістарычным цэнтрам «Явар».

0 233


Культура

Канстанцін Селіханаў: Сучаснае мастацтва — складанае па азначэнні, яно не з'яўляецца крыніцай радасці

0 331



© 1998—2019 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ "Выдавецкі дом "Звязда".
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Создание сайта webxayc.by